**Ламека Н. У. (Мінск)**

# ПРАГА Ў МАСТАЦКАЙ ПРАСТОРЫ РАМАНА ЛЕО ПЕРУЦА «НОЧЫ ПАД КАМЕННЫМ МОСТАМ»: РЭАЛЬНАЕ І МІСТЫЧНАЕ

Канцэптуальным у плане разумення спецыфікі аўстрыйскай «магічнай» літаратуры з'яўляецца раман Лео Перуца «Ночы пад каменным мостам». Цыкл замалёвак з чэшскага жыцця мяжы XVI-XVII стагоддзяў аб'яднаны адзіным месцам дзеяння – Прагай. Перуц падрабязна ўзнаўляе непаўторную атмасферу горада ў эпізодах жыцця як рэальных герояў: імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Рудольфа II Габсбурга, банкіра Мардэхая Майзэля, рабі Лёва, астранома Іягана Кеплера, графа Валенштэйна, так і шэрагу персанажаў, створаных мастацкай фантазіяй. На першы погляд можа падацца, што гэта зборнік самастойных навел, але паступова асобныя сюжэтныя лініі зліваюцца, а лёсы галоўных персанажаў пераплятаюцца ў загадкавую гісторыю шчырага кахання і неўсвядомленай здрады, якая чыніцца ў варунках жыцця і смерці, росквіту і заняпаду дзяржавы.

«Асаблівы каларыт пражскаму нямецкамоўнаму экспрэсіянізму надаваў містыфікаваны вобраз Прагі, які складаўся яшчэ ў дзіцячай свядомасці пісьменнікаў, але ў іх сталай творчасці ўвасобіўся ў сімвал неспасцігальна ірацыянальнай, непераадольнай адчужанасці асобы ад знешняга свету» [1, с. 26], – так характарызуе А. Гугнін спецыфіку урбаністычнага пейзажу ў такіх раманах, як «Працэс» Франца Кафкі і «Голем» Густава Майрынка. Праблема самотнасці, адзіноты і страты сувязей з рэчаіснасцю – адна з важных і ў празаіка Перуца. Аднак у параўнанні з творамі Кафкі, Прага ў яго рамане не злавеснае месца, у якім пануе стыхія абсурду, а казачная прастора, дзе суіснуюць у гармоніі смутак і радасць.

Нягледзячы на тое, што час і месца дзеяння рамана акрэслены дакладна – Прага эпохі Рудольфа II, – хранатоп твора досыць спецыфічны. Структурна можна вылучыць тры сферы, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і яднаюцца ў адзіную прастору. Першая – Прага мяжы XVI-XVII стагоддзяў, рэзідэнцыя імператара. Перуц маляўніча і дэталёва апісвае вулачкі, будынкі горада, Пражскі град, а галоўнымі героямі рамана абірае слынных гістарычных асоб.

Другая – сучасны аўтару горад мяжы XIX-XX стагоддзяў. Раман сваёй архітэктонікай нагадвае «Дэкамерон» Джавані Бакача, «Кентэрберыйскія аповеды» Джэфры Чосера, «Гептамерон» Маргарыты Наварскай. Падобныя паралелі маюць сімвалічнае гучанне, паколькі абраная Перуцам форма твора сугучна яго зместу: расповед пра эпоху Адраджэння па жанру нагадвае стылізаваны рэнесансны зборнік навел. Такое кампазіцыйнае рашэнне патрабуе прысутнасці персанажа-апавядальніка. Кандыдат медыцыны, студэнт Якаб Майзэль час ад часу знаёміць свайго вучня (лірычнага героя Перуца) з дзіўнымі гісторыямі з пражскага мінулага.

Два згаданыя прасторава-часавыя пласты рамана знаходзяцца ў арганічным узаемадзеянні. Перуц-грамадзянін Аўстра-Венгрыі і Перуц-эмігрант, выгнаннік быў сведкам пераломнай эпохі; Прага, у якой ён

нарадзіўся і чый вобраз захаваў у памяці, – горад зменлівага лёсу. Зварот аўтара да часоў Рудольфа II невыпадковы, з яго іменем звязаны сацыяльны і культурны росквіт горада, а апошнія гады кіравання і трагічныя падзеі пасля смерці імператара (параза чэхаў ля Белай Гары, Трыццацігадовая вайна) сталіся пачаткам доўгачасовага багемскага заняпаду. «Ночы пад каменным мостам» не назавеш гістарычным раманам: занадта вольна абыходзіцца аўтар з фактамі, часам аддаючы перавагу паданню і легендзе. Аднак ён вельмі праўдзіва і дакладна перадае пражскі каларыт. Прага – адзін з еўрапейскіх гарадоў, які праз стагоддзі захаваў сваё непаўторнае, сфармаванае рознымі мастацкімі эпохамі аблічча. З пункту гледжання архітэктуры, гэта сапраўдны музей, наведвальнік якога спасцігае і містычную патаемнасць готыкі, і багацце светлаценяў барока, і выкшталцоную Красу ар нуво. Сучаснасць у творы – апошнія дні існавання яўрэйскага гета, калі студэнт Майзэль са скрухай назірае, як ператвараецца ў пыл «скарб» яго продка – узведзеныя калісьці на грошы Мардэхая-Маркуса дамы. Але нават пасля знішчэння большасці сярэднявечных пабудоў такія помнікі пражскай даўніны, як сінагога Альтнойшуле і Старыя яўрэйскія могілкі, становяцца сімваламі традыцыі, спадчыны і гісторыі, злучаюць мінулае і сённяшні дзень. Даследчык Х. Х. Мюлер слушна зазначае, што ў рамане «са стрыманай скрухай і сур’ёзным гумарам намалявана карціна эпохі, культурнае аблічча якой назаўжды знікла толькі з надыходам другой сусветнай вайны» [2, с. 267, *пераклад наш – Н. Л.*].

Самая незвычайная – трэцяя Прага, горад прывідаў і зданяў, таямнічае іншабыццё. Як выбітны экспрэсіяніст, Перуц адчувае прысутнасць нябачных ніцей, што яднаюць рэчаіснасць з неспазнаным светам, схаваным ад зроку смяротных людзей. Прасторавыя межы яго можна вызначыць дакладна – Пражскі Град, Градчаны, Мала Страна, Карлаў мост, яўрэйскі квартал. Але час дзеяння нельга суаднесці выключна з эпохай Рудольфа II. Пісьменнік, які відавочна прытрымліваецца думкі аб несмяротнасці душы, паказвае, што насельнікі загадкавага іншасвету, яго веснікі – памерлыя альбо дзівосныя фантомы, якія пазбавіліся зямнога гнёту і перайшлі ў вечнасць. Так, старыя блазны-музыкі Екеле-Дурнічка і Копель-Мядзведзь двойчы становяцца сведкамі, як тыя ўзнікаюць на вуліцах гета, раскрываюць праўду пра трагічныя падзеі і прарочаць лёсы асобных герояў. У навеле «Чума ў яўрэйскім горадзе» гэта душы памерлых дзяцей, што сваімі жыццямі павінны сплаціць грэх чароўнай Эстэр і Рудольфа. У «Кубку гарэлкі» распавядаецца, як сябры выпадкова падслухоўваюць, што адбываецца на навагоднім свяце ў Альтнойшуле, даведваюцца, каго ў бліжэйшым часе чакае смерць.

Адметны персанаж рамана – рабі Лёў, мысляр, філосаф, надзвычай магутная асоба. Гэта адзіны герой Перуца, які ведае, як зазірнуць за межы асязальнага і матэрыяльнага. Паводле легенды, менавіта ён стварыў Голема, ажывіў гліняную істоту з дапамогай «практычнай кабалы». У рамане рабі неаднаразова звяртаецца да магіі, уплываючы такім чынам на жыцці людзей – ад простых яўрэйскіх гараджан да рымскага імператара. Дзейнасць чараўніка абумоўлена яго шчырай занепакоенасцю лёсам свайго народа. Так,

імкнучыся выратаваць яўрэяў ад выгнання з Прагі, ён вымушаны «аб'яднаць» сэрцы Рудольфа і прыгажуні Эстэр. Але як мудры чалавек, які не хоча ні гора сваім супляменнікам, ні гвалту і сораму для жонкі Майзэля, ён адважваецца на невялікую хітрасць. Кожную ноч душы імператара і маладой жанчыны перасяляюцца ў кветкі ружы і размарына, што да світання шэпчуцца-мілуюцца пад Каменным мостам. Каханне расцвітае ў іншасвеце, у прасторы сну і фантазіі, пасля абуджэння застаецца толькі скруха і смутак па нечым няўлоўным і недасяжным. Як у платонаўскай канцэпцыі двайнога быцця душа ў «свеце рэчаў» захоўвае памяць пра «свет ідэй», так і героі рамана не могуць пазбыцца адчування ўзаемнай прысутнасці. Перад смерцю Эстэр у паўпрытомнасці кліча: «Рудольфе, дапамажы», а шмат пазней імператар па памяці геніяльна малюе партрэт каханай, якую ён бачыў толькі аднойчы.

У прасторы рамана Каменны мост можна лічыць своеасаблівым пачаткам усіх дарог, сэрцам горада. Па-першае, ён геаграфічна злучае два берагі Влтавы, праз яго пралягае шлях з Пражскага Града да яўрэйскага квартала – з імператарскага замка да дома Майзэля і Эстэр на пляцы Трох Калодзежаў. Па-другое, ён аб'ядноўвае рэчаіснасць з іншабыццём: менавіта там вандроўніцы-душы набываюць новую плоцевую абалонку. Пялёсткі і лісце прыпадабняюцца да чалавечага цела: дастаткова абарваць кветку, каб зямное жыццё скончылася.

Гісторыя ружы-Рудольфа і размарына-Эстэр нагадвае сярэднявечныя аповеды пра трагічнае каханне, гвалтоўны разрыў і злучэнне лёсаў пасля смерці, распаўсюджаныя ў народных баладах і куртуазнай літаратуры. Над магіламі герояў звычайна вырастаюць ружа і шыпшына і назаўсёды сплятаюць свае вецце. Перуц крыху па-іншаму выкарыстоўвае гэты ўстойлівы сюжэт: яго кветкі штоночы даюць прытулак душам жывых людзей. Але адначасова чароўныя расліны існуюць і ў прасторы вечнасці, якая ў дадзеным выпадку не выступае абсалютным сінонімам смерці. Нават калі Эстэр памірае, яе вобраз захоўвае ўладу над імператарам. Рудольф усё больш аддаляецца ад свайго асяроддзя, усё глыбей патанае ў бездані адчужэння, усё мацней адчуваюцца прыкметы яго хваравітага псіхічнага стану. Адзіна важнымі для яго застаюцца цяпер толькі мастацтва і памяць пра Эстэр.

Пражская нямецкамоўная літаратура мяжы XIX–XX стагоддзяў знаходзілася на перасячэнні багемскай, яўрэйскай і нямецкай традыцый. Макс Брод, Франц Кафка, Франц Верфель, Густаў Майрынк дакладна перадаюць характэрны для горада цесны суплёт розных культур і нацыянальных менталітэтаў. Не выключэнне і Перуц, які ўслаўляе чэшскае мінулае, паказвае Прагу як адзін з культурных цэнтраў магутнай краіны. Сярод каларытных герояў-чэхаў у рамане вылучаюцца Пётр Заруба – студэнт-вальнадумец, што марыць пра багемскае адраджэнне, яго сваяк Іржы Каплірж – чалавек даволі прыземлены, але с цвярозым практычным розумам, Антон Броўза – былы імператарскі блазан, выключна кемлівы і вынаходлівы.

Пісьменнік раскрывае велізарную ролю імператара-аўстрыйца ў лёсе рэнесанснай Прагі, якая ў час яго валадарання дасягнула асаблівага росквіту і

велічы. Рудольф II быў аматарам мастацтва, заўзятым калекцыянерам жывапісу, дзякуючы яму ў чэшскай сталіцы застаўся надзвычай багаты збор кніг, палотнаў, манет, камянёў, мінералаў, размаітых каштоўнасцей і рэдкіх артэфактаў. Ён шмат зрабіў для перабудовы горада, запрашаў да супрацоўніцтва слынных еўрапейскіх вучоных Ціха Браге, Іягана Кеплера (аднаго з герояў рамана), жывапісцаў Барталамея Шпрангера, Адрыяна дэ Фрыза, Ханса фон Ахена. Адзін з самых наватарскіх майстраў эпохі, прыдворны мастак Габсбургаў Джузэпе Арчымбольда стварыў геніяльны партрэт Рудольфа – «Вертумн». Рымскі імператар у творы Перуца сапраўды падобны да старажытнаіталійскага бога сезонаў, зменаў і росквіту раслін: падчас яго кіравання Прага – дзіўны пладаносны сад, які зачароўвае вандроўнікаў з усёй Еўропы. Пісьменнік перадае шматграннасць натуры Рудольфа: адначасова гэта і мудры, магутны ўладар, і вельмі самотная асоба, чалавек з няўстойлівай псіхікай і слабым здароўем.

Перуц услаўляе і ўласны народ, стварае цэлую галерэю персанажаў – ад самых уплывовых у яўрэйскай абшчыне рабі Лёва і мецэната Мардэхая Майзэля да вясельных музыкаў, бедакоў Екеле-Дурнічкі і Копеля-Мядзведзя. Прываблівае асоба прыгажуні Эстэр, якая з’яўляецца толькі ў аповедах і ўспамінах іншых герояў рамана. Шчырае спачуванне выклікаюць лёсы памерлых дзяцей, сярод якіх вылучаецца маленькая Блюмхен, улюбёная ў жыццё і спевы старога Екеле. Пра цяжкі лёс нацыі асабліва пранізліва нагадвае навела «Сарабанда». Яе герой, харвацкі барон Юраніч, помсціць за знявагу графу Калальта і прымушае крыўдзіцеля танчыць па пражскіх вуліцах пад прыцэлам мушкетаў. Пісьменнік бліскуча выяўляе ўнутраны стан чалавека, апантанага нянавісцю. Нішто не можа спыніць Юраніча, толькі створаны магіяй рабі Лёва відзеж-ікона Ecce Homo ўражвае і прасвятляе яго, заклікае да міласэрнасці. Але гэта не палатно евангельскага зместу: замест Хрыста на сцяне ўзнікае карціна шматвекавых пакут яўрэйскага народа.

Як квінтэсенцыя твора ўспрымаецца думка іспанскага пасла: «Рэчы выключныя сталі пры пражскім двары абсалютна звыклымі» (навела «Генрых з пекла»). Адлюстраванне звышнатуральных падзей як цалкам арганічных і штодзённых – прыкмета літаратуры магічнага рэалізму, у кантэксце якой часта разглядаюць познюю прозу Перуца. Гэтаму творчаму метаду ўласціва канцэпцыя «двайнога бачання» сусвету, характэрная для рамантызму і сімвалізму. Традыцыйна трывалыя межы паміж рэальным і фантастычным, рацыянальным і ірацыянальным у рамане пісьменніка амаль незаўважныя. Яго героі – на скрыжаванні рэчаіснасці і фантазіі, у сілавой прасторы мроі, здольныя спасцігнуць невераемныя таямніцы быцця.

Літаратура:

1. Энциклопедический словарь экспрессионизма / Гл. ред. П. М. Топер. М., 2008.

2. Müller H. H. Das Echo des Lachens // L. Perutz. Nachts unter der steinernen Brücke. München, 2008.